View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

Хоміч Т. П., Мінск

# Вайна-ўспамін і вайна-“рэальнасць” у паэтычным свеце Аляксея Пысіна

Узлёт мастацкага таленту беларускага паэта XX стагоддзя Аляксея Пысіна адбыўся ў 60-я гг. – перыяд, калі нацыянальная літаратура стаяла на шляху пераадолення публіцыстычнасці, апісальнасці, павярхоўнага разумення падзей вайны 1941— 1945 гг. Кнігі А. Пысіна, якія з’явіліся ў гэты час, засведчылі нараджэнне мастака, здольнага да глыбокага філасофскага абагульнення і асэнсавання ўрокаў найвялікшай трагедыі XX стагоддзя. У паэтычных зборніках “Мае мерыдыяны” (1965), “Твае далоні” (1967) выразна праявілася сталасць светапогляду аўтара, якая, па словах У. Гніламёдава, з’яўляецца неабходнай умовай таленту паэта-філосафа (“...Мала аднаго эмацыянальнага пачуцця жыцця, мала ўмення пісаць вершы, думаць вобразамі... Патрэбна сталасць светапогляду, які, у сваю чаргу,.. дабратворна ўплывае на развіццё майстэрства” [1: 203]). Светаўспрыманне А. Пысіна, як і ўсіх літаратараў, што прайшлі горкія універсітэты вайны, у многім вызначыла ўбачанае і перажытае падчас вядомых гістарычных падзей. Пра самога сябе мастак пісаў: “Мой дух, мой крок пяхота гартавала // Агнём і ліўнем, боем нелюдскім” [2: 164]. Пры ўсёй тэматычнай шырыні, пры звароце да разнастайных праблем быцця ў паэзіі творцы, у цэлым, дамінуе філасофскае пераасэнсаванне ваеннага вопыту.

Вершы А. Пысіна цяжка назваць, у поўным сэнсе гэтага слова, “ваеннымі”, бо ніводзін з іх не быў напісаны непасрэдна ў перыяд пакутлівых выпрабаванняў 1941—1945 г.г., калі аўтар знаходзіўся ў шэрагах абаронцаў Айчыны. Тым не менш вобраз вайны ўваходзіць у мастацкі свет паэта, прычым звычайна двума шляхамі: па-першае, як успамін лірычнага героя; па другое, як “рэальная” карціна трагедыі, убачаная вачыма лірычнага героя-салдата і перададзеная цяперашнім граматычным часам (гэта датычыцца “элегічных балад” [3: 126]).

Успаміны пра вайну ў творчасці А. Пысіна ёсць не толькі ўзнаўленне ў памяці карцін мінулага, але і роздум над трагічным лёсам загінуўшых аднапалчан. Франтавое сяброўства ў паэзіі мастака – гэта невычэрпны боль страты і непераадольнае жаданне сустрэцца з салдатамі, жыццё якіх абарвалася. З надзеяй яшчэ раз убачыць твары франтавікоў лірычны герой А. Пысіна штохвілінна “вяртаецца” ў часы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ваеннай маладосці. Нярэдка мінулае настолькі моцна ўплывае на яго свядомасць, што “пранікае” ў сучасны дзень. У вершы “Раскалыхалі птахі вышыню...” следам за “прывідным і яркім” успамінам пра сяброў лірычны герой нібы забывае, у якім часе ён знаходзіцца, і пачынае па ваеннай звычцы сувязіста выклікаць палявыя станцыі: “Я неаднойчы выклік паўтарыў, // А даль маўчыць, // А цішыня нямее” [2: 218]. Падобная сітуацыя паўтараецца і ў іншых творах А. Пысіна, у нечым яна нагадвае стан галюцынацыі, навеянай горкімі ўспамінамі. Так, за вясенняй паводкай Пцічы паўстае карціна ваеннай пераправы, і ўзнікае жаданне клікнуць: “Хто на свеце жывы, на тым беразе!” [2: 200]. Ці раптам “барвовы лістапад” перад вачыма прымушае засумнявацца: “Агонь ці кроў сцякае па дубровах, // І на зямлі сухой агонь ці кроў?” [2: 186].

Для вершаў-успамінаў А. Пысіна надзвычай характэрна асацыятыўнасць мыслення. Самы нязначны знешні штуршок можа ўваскрасіць у памяці цэлыя гісторыі ці проста малюнкі мінулых баёў, у якіх удзельнічаў сам паэт. Стук “лыжак у аркестры народным” [2: 370] навявае роздум пра санінструктара Савельева, які заўсёды меў пры сабе “прыціхлы дэсант” каштоўных для салдата лыжак. Стракатанне конікаў на прыбалтыйскіх балотах выклікае ўспаміны пра “балотна-мінны пояс Ліепаі” [2: 145], дзе ворагі, адступаючы, клалі побач з мінамі зваблівыя трафеі: гадзіннікі і компасы. Гэтая асацыяцыя становіцца прычынай зліцця часоў у свядомасці лірычнага героя, і  ён зноў не можа дакладна вызначыць сваё месцазнаходжанне: у сённяшнім дні ці ў мінулым: “Стракочуць конікі ці стрэлкі тыя?”

Кульмінацыйным момантам для ўспамінаў лірычнага героя становіцца ноч як адзін з часавых вобразаў у мастацкім свеце А. Пысіна. Ноч у паэзіі мастака – гэта перыяд трансфармацыі памяці ў плынь бессвядомага – у “неадступныя” сны. Сны вяртаюць у ваенны час незалежна ад жаданняў асобы і не даюць магчымасці пераасэнсоўваць падзеі мінулага. Яны хутчэй уяўляюць сабой жудасную навалу карцін вайны, якія пастаянна паўтараюцца і абмяжоўваюць волю лірычнага героя. У вершы “Начныя госці – кажаны...” тонка падмечаны прыкметы жахлівай нерухомасці ў кашмарным сне: “Крычу, здаецца, -- а маўчу, // Спяшаюся, -- а ўсё на месцы...” [2: 240]. Заўважым, што характар вобразаў ночы і сну змяняецца на працягу творчага шляху А. Пысіна, “няўмольнасць” і жорсткасць прывідаў нарастае. Калі ў 1960 годзе лірычны герой бачыць “у сне сяброў”, у 1961 – перад яго вачыма “купал каскі”, а самі сны нагадваюць “ракетныя успышкі”, то ў 1967 годзе сны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– гэта ўжо “пажары” ці “хімеры”, якія парушаюць гармонію, парадак у свеце, і жаба ў іх пачынае “квапіцца на белы сад”, а салавей “сірэнаю жалезнай свішча”. У вершы “Асенніх кветак белы карнавал...” (1967) ноч паглынае “даль і высь”, звужае прастору да памераў “патушанага квадрата кватэры”. Невыпадкова, што пасля такіх рэзкіх змен прасторы лірычнаму герою, свет якога па-за снамі не мае межаў, цяжка вярнуцца да рэальнасці: раніцай замест звычайнага неба ён бачыць “сцяну”, – напэўна, увасабленне няўлоўнай мяжы паміж ваенным і сённяшнім светаадчуваннем. Такім чынам, ноч у лірыцы паэта – гэта час нестрыманых свядомасцю, абвостраных успамінаў героя, якія, падобна асацыятыўным, спрыяюць пастаяннаму дыялогу з мінулым.

Вершы-ўспаміны А. Пысіна пазначаны ўсёпаглынальным пачуццём віны і абавязку лірычнага героя перад тымі, хто загінуў, абараніўшы тым самым яго існаванне. З гэтага пачуцця ўзнікла вядомае выказванне паэта: “...Я належу // Ў пэўнай меры – не адным жывым” [2: 224], -- яго канцэпцыя ўзаемаадносін свету жывых з мёртвымі, сучаснасці з мінулым. Абавязак перад сябрамі вымушае героя штораз сцвярджаць нямарнасць іх смерці і неабходнасць захавання памяці пра воінаў. У мастацкім светаўспрыманні А. Пысіна памяць – адзін з галоўных шляхоў пераадолення смерці салдат, што загінулі на полі бою. В. Бечык заўважаў у творах паэта “жаданне адваяваць сяброў у нябыта, сцвердзіць іх месца сярод жывых” [4: 74]. Разам з гэтым неадступная памяць стала прычынай своеасаблівага погляду мастака не толькі на смерць, але і на іншыя быційныя і маральныя пытанні. Амаль заўсёды паэт усведамляе праблемы рэчаіснасці пасля таго, як “прапусціць” іх праз незабыўныя ваенныя перажыванні. Сам час, хуткаплынны рух секунд і мінут ён параўноўвае з хадою “сотні радавых на маршы дня” [2: 164] ці, у больш шырокім маштабе, з няспынным крокам “батальёнаў”, якія “не раз і не двойчы... // Абагнулі наўпрост шар зямны” [2: 224], адступаючы далей ад апошніх баёў. Памяць пра ваеннае мінулае падштурхоўвае лірычнага героя да асэнсавання філасофскіх паняццяў вечнага-нявечнага. Вайна, паводле А. Пысіна, вядзе да агульнай хаатычнасці ў гарманічным па сваёй прыродзе свеце, яна парушае саму вечнасць: “Усё здавалася нявечным // Пасля баёў і горкіх страт” [2: 187]. У сваю чаргу, подзвіг салдат, што загінулі, але духоўна перамаглі ворага, аднаўляе парушаную раўнавагу і сам становіцца вечнасцю, дзякуючы памяці будучых пакаленняў. У вершы “Палёт” паэт уяўляе смерць сяброў вогненнай дарогай у “глыбіню зямлі”, якая, “адбіўшыся ў зямной спрадвечнасці”, паўстае “ў зорнай бесканечнасці”, застаецца ў памяці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чалавецтва навечна. Такім чынам, канцэпт смерць у творах-успамінах А. Пысіна напоўнены дваякім сэнсам: з аднаго боку, гэта небыццё, з другога – шлях у вечнасць.

З пазіцыі былога франтавіка паэт глядзіць на маральную недасканаласць чалавецтва, сваіх сучаснікаў і маладога пакалення. Яго лірычны герой катэгарычна непрымірымы з няшчырасцю, са здрадай, з бездухоўнасцю. “Была мне школаю мая // Гвардзейская дывізія” [2: 281], -- апраўдвае ён сваю катэгарычнасць. Школа вайны не ачарсцвіла душы, не выхавала жорсткасць, наадварот, навучыла дакладна вызначаць “халуйства, зайздрасць і ману” і, знаходзячыся на крок ад смерці, пазбаўляцца ад адмоўных якасцяў. Памяць пра гэтыя ўрокі (а ў больш шырокім сэнсе і пра тое, што асабістае жыццё чалавека заканчваецца (“memento mori”), але яго ўчынкі, добрыя і благія, пакідаюць адбітак у свеце) не дазваляе лірычнаму герою дзейнічаць амаральна і ў мірны час.

Паралельна з вершамі-ўспамінамі, дзе галоўная ўвага надаецца захаванню памяці пра загінуўшых салдат, а лірычны герой пастаянна перамяшчаецца з сучаснага дня ў мінулы, і наадварот, у паэзію А. Пысіна ўваходзяць творы, якія перадаюць дакладны трагедыйны сюжэт, “рэальную” карціну вайны. М. Мішчанчук называе іх “элегічнымі баладамі”, бо яны змяшчаюць у сабе і элегічны пачатак – “рэквіем па тых, хто не вярнуўся з вайны” [3: 126], і ярка выражаны трагедыйны, характэрны для балады. Такія вершы, па словах даследчыка В. Чараднічэнкі, “абапіраюцца на тып часавых адносін, заснаваных на ілюзіі ўдзелу ў падзеях твора” [5: 74]. Сапраўды, у элегічных баладах А. Пысіна мастацкае мінулае выражаецца цяперашнім граматычным часам, і лірычны герой, ветэран, уяўляе сябе побач з салдатамі на полі бою:

Нябёсам горача... У наступленні
Вясна і мы – ў калонах штурмавых.
На даляглядзе ўздыбленыя цені
Ўчарашніх катаў – мёртвых і жывых... [2: 131]

Сучаснасць, у якую раз-пораз вяртаецца герой вершаў-успамінаў, тут адсутнічае наогул, мастак узнаўляе толькі рэальны воблік вайны. У тэксце вершаў няма ні абагульненняў, ні разваг, на першым плане – жахлівая трагедыя чалавецтва.

Асаблівы сэнс у элегічных баладах А. Пысіна маюць прасторавыя характарыстыкі вобраза вайны. Самы важны элемент ваеннай прасторы – дарога. У паэзіі творцы гэта шлях у гарызантальным кірунку, прычым шлях дэфармаваны, “няроўны” (перарываецца боем, балотам, “акопамі”,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“парваным” долам і г.д.). Шлях, які не мае заканчэння. Лірычнаму герою хочацца верыць, што ён вядзе да мірнага жыцця: “Дарога адна, дарога туды, // Дзе будзем анучы ў цяпле сушыць, // Да раніцы спаць, да старасці жыць” [2: 216]. Але невыносная цяжкасць ваеннай дарогі стварае ўражанне, што наперадзе няма ніякага прасвету: “Дождж. Балота. Даль без далягляда. // Безвыходнасць каляін” [2: 218]. І паабапал дарогі – звар’яцелы свет, хаос, суцэльная дысгармонія, перададзеныя паэтам метафарычна: “вогненны апад”, “сосны ад вільгаці п’яныя”, “снарады ўвінчвае ў пласты” і г. д.

Ваенная прастора ў элегічных баладах А. Пысіна здольна звужацца і пашырацца. Так, у вершы “Зямля нязжатымі снапамі...” звужэнне выяўлена ў цесным кантакце элементаў вертыкальнай і гарызантальнай прасторы – неба і зямлі: “Зямля нязжатымі снапамі // Падпёрла бледны небакрай”. А ў творы “Пярэдні край. Чужы. Неразгаданы...” прастора пашыраецца за кошт з’яўлення ў вершаваных радках мастацкай дэталі – птушак у небе пасля бітвы, якая закончылася: “Снег раставаў. Звінелі ў небе птушкі, // І зелянеў абпалены дзірван”. Часам ваенная прастора становіцца двухмернай, калі сярод цеснаты акопа ці поля бою ўзнікае адчуванне бязмежнасці. У гэтым плане арыгінальнымі падаюцца прасторавыя метафары: “акоп на шматочку планеты”, “балота – і свет, і сусвет” і інш. Такія характарыстыкі мастацкай прасторы дакладна перадаюць уласнае ўспрыманне А. Пысіным ваеннай рэчаіснасці.

Сярод элегічных балад паэта варта выдзеліць групу твораў, дзе аўтар вымалёўвае партрэты яркіх асоб – герояў вайны, прычым, у А. Пысіна гэта, як правіла, нявыдуманыя людзі. Мастак нават спрабуе раскрыць характары герояў, хаця магчымасці лірыкі ў гэтым плане невялікія. Дзеля гэтага ён выкарыстоўвае ў вершах прыёмы абагульнення і стварае атмасферу эмацыянальнай напружанасці. “Партрэтныя” [6: 311] балады “Артылерыст Сірацінін”, “Васількі”, “Балада пра сувязіста”, “Пяць патронаў у абойме...”, “Вось п’едэстал...” і інш. уяўляюць сабой гісторыі пераломных момантаў у жыцці звычайных людзей ва ўмовах вайны. Гэта сітуацыі складанага выбару паміж баязлівым жыццём і гераічнай смерцю.

Партрэтныя балады А. Пысіна адрозніваюцца своеасаблівай суб’ектнай структурай. Большасць вершаў мастака ёсць медытацыі, успаміны лірычнага героя ці элегічныя балады з лірычным героем – непасрэдным удзельнікам падзей мінулага. У гэтых жа творах прысутнічае аўтар-апавядальнік і персанаж, пра лёс якога ідзе размова

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

("Балада пра сувязіста"), ці ролевы герой, як у баладзе "Пяць патронаў у абойме...". А ў вершы "Артылерыст Сірацінін", напрыклад, наогул цяжка ўлавіць мяжу паміж аўтарам-апавядальнікам і героем, які глядзіць на сябе як бы збоку і звяртаецца да самога сябе. Вобраз вайны ў партрэтных баладах прысутнічае ўскосна, і менавіта адметнасці суб'ектнай структуры такіх твораў надаюць яму адчувальную рэальнасць трагічных падзей.

Вершы-ўспаміны Аляксея Пысіна пра франтавых сяброў і творы, у якіх аўтар імкнецца аднавіць рэальныя карціны вайны, арганічна ўплятаюцца ў паэтычны свет мастака, дзе ёсць месца і жывым, і мёртвым, дзе ўсё імкнецца да прымiранай гармоніі, а памяць нашчадкаў пра мінулае і яго герояў здольна аднавіць раўнавагу існага, парушаную ваенным ліхалеццем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Літаратура**


1. Гніламёдаў У. Ад даўніны да сучаснасці: Нарыс пра беларускую паэзію. – Мн., 2001. – 246 с.
2. Пысін А. Збор твораў: У 2 т. Т. 1: Вершы. – Мн., 1989. – 399 с.
3. Мішчанчук М. І. Ёсць у паэта свой аблог цалінны: Жанрава-стылявая разнастайнасць сучаснай беларускай лірыкі. – Мн., 1992. – 189 с.
4. Бечык В. Правам салдата і сейбіта // Бечык В. Свет жывы і блізкі: Літ.-крытыч. Артыкулы. – Мн., 1974. С. 73 – 81.
5. Чередниченко В. И. Типология временных отношений в лирике. – Тбилиси, 1986. – 196 с.
6. Рагойша В. П. Паэтычны слоўнік. – 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мн., 1987. – 414 с.